**В.І.Саітава,** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

# НАПРАМКІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ДАСТУПНАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ РЭСУРСАЎ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

Даступнасць інфармацыі з'яўляецца фундаментальным правам людзей. ІФЛА абвясціла гэта права ў Дэкларацыі аб бібліятэках, інфармацыйных службах і інтэлектуальнай свабодзе (2002) [1]. ІФЛА звяртае ўвагу і на вырашэнне пытання забеспячэння даступнасці лакальных і аддаленых электронных інфармацыйных рэсурсаў.

Сярод разнастайных кірункаў дзейнасці беларускіх бібліятэк у галіне краязнаўства на сучасным этапе найбольш прыярытэтнымі з'яўляюцца падрыхтоўка электронных бібліяграфічных рэсурсаў і ўдасканаленне доступу да іх. Захоўваюць сваё значэнне карткавыя і друкаваныя формы краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў.

На шляху задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў у краязнаўчых ведах і інфармацыі пытанні даступнасці краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі паўстаюць і вырашаюцца ў розных тэарэтыка-метадычных, арганізацыйна-кіраўніцкіх і тэхналагічных аспектах. У гэтым артыкуле разглядаюцца некаторыя з іх, найбольш актуальныя з пункту ацэнкі аўтарам сучаснай практычнай дзейнасці бібліятэк Беларусі. Гэта павелічэнне краязнаўчых электронных рэсурсаў, прадстаўленне іх праз лакальны доступ і Інтэрнет, структураванне на сайтах. На даступнасць традыцыйных (карткавых і друкаваных) краязнаўчых рэсурсаў уплываюць асаблівасці сучасных умоў бібліятэчнай дзейнасці, тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца але такі аспект намі не разглядаецца.

Адметнай тэндэнцыяй з'яўляецца хуткі рост электронных краязнаўчых рэсурсаў, асабліва баз даных. Хутка папаўняюцца ў абласных бібліятэках і ЦБС бібліяграфічныя базы даных “Краязнаўчая літаратура”. Яны з'яўляюцца найбольш поўным рэсурсам, які забяспечвае інтэлектуальны (ідэальны) доступ да крыніц вывучэння гісторыі рэгіёна. Уключаюць бібліяграфічныя запісы кніг, брашур, выяўленчых выданняў, карт, матэрыялаў з кніг, зборнікаў, перыядычных выданняў і інш. Дынамічна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіваюцца і бібліяграфічныя базы, прысвечаныя культуры і мастацтву абласцей. Так, БД “Краязнаўчая літаратура” Магілёўскай АБ налічвае звыш 35 тыс. дакументаў, БД “Інфармацыя па культуры і мастацтве. Брэст і Брэсцкая вобласць” Брэсцкай АБ – звыш 19 тыс. дакументаў. Гэтыя значныя лічбы дасягнуты ў выніку дзейнасці па рэтраканверсіі карткавых краязнаўчых каталогаў, падрыхтоўцы бібліяграфічных запісаў на новыя краязнаўчыя дакументы. У напрамку павелічэння электронных краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў дзейнічаюць і ЦБС рэспублікі. Дамінаванне аналітычных матэрыялаў – характэрная рыса дакументнага патоку па краязнаўстве, што цалкам праяўляецца і ў бібліяграфічных базах даных.

Доступ да бібліяграфічных баз даных па краязнаўстве ў абласных бібліятэках арганізаваны праз электронныя каталогі ў лакальных сетках і ў Інтэрнеце. Створаныя на аснове праграмнага забеспячэння Alis 2000 (за выключэннем Гомельскай АБ), яны дазваляюць весці просты і пашыраны пошук па масівах бібліяграфічных запісаў. У электронных каталогах захавалася пераемнасць метадычных падыходаў да адбору дакументаў, выпрацаваная пры вядзенні карткавых краязнаўчых каталогаў. Але вынікі апрацоўкі дакументаў у электронных каталогах (індэксаванне з дапамогай розных інструментаў) палепшылі для карыстальнікаў доступ да краязнаўчых дакументаў. Ва ўмовах распаўсюджвання ў бібліятэчным асяроддзі нацыянальнага фармату BelMARC у будучым прадстаўляецца неабходным і важным з пункту гледжання стварэння і выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі, у тым ліку краязнаўчай, пераход на гэты праграмны прадукт публічных бібліятэк.

Аднак праблему даступнасці найбольш дасканала вырашаюць вялікія магчымасці аддаленага доступу да генерыруемых бібліятэкамі краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў і аператыўнага пошуку ў значных масівах даных. Асаблівую важнасць “публікацыі” на бібліятэчным сайце унікальнага рэсурсу – краязнаўчай інфармацыі – адзначыла І.Пілко [2].

Праз web-каталогі (Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай АБ) краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя даступна неабмежаванаму колу аддаленых карыстальнікаў. У спісах баз даных, даступных праз web-каталогі, выдзелены базы даных па краязнаўстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Расійскі вопыт размяшчэння самастойных электронных каталогаў па краязнаўстве на бібліятэчных сайтах (хаця яны нярэдка "губляюцца" сярод іншых рэсурсаў), як і вопыт беларускіх бібліятэк (нягледзячы на розныя падыходы да размяшчэння электроннага каталога на сайтах), падаецца прымальным, тым не менш, на наш погляд, важна сканцэнтраваць краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы на галоўнай старонцы сайта.

Развіццё сервісных функцый электронных каталогаў бібліятэк ставіць задачу забяспечыць і доступ да алічбаваных копій каштоўных краязнаўчых дакументаў (з улікам аўтарскага права). Вопыт Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая прадастаўляе карыстальнікам магчымасць праз спасылкі ў электронным каталогу пераходзіць ад бібліяграфічных запісаў да алічбаваных тэкстаў лепшых краязнаўчых выданняў мінулага, арыентуе іншыя бібліятэкі на падобнае вырашэнне пытання даступнасці краязнаўчай інфармацыі.

Бібліятэкі размяшчаюць на сайтах анатаваныя спісы друкаваных і электронных бібліяграфічных і іншых выданняў. Некаторыя з іх дэманструюцца з рэкламна-інфармацыйнымі мэтамі. Гэта друкаваныя дапаможнікі, звесткі аб якіх можна атрымаць па прадстаўленых вокладках і анатацыях. Частка краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў даступная для пошуку. Асаблівую ўвагу магчымасцям доступу да краязнаўчых бібліяграфічных паказальнікаў надае Віцебская АБ, на сайце якой выстаўляюцца персанальныя і біябібліяграфічныя паказальнікі, каляндар знамянальных і памятных дат. З дапамогай сістэмы спасылак магчыма весці пошук па раздзелах, рубрыках дапаможных імянных і геаграфічных паказальнікаў. У большасці бібліяграфічныя паказальнікі захаваны ў фармаце .pdf. Паколькі друкаваныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі тыражуюцца бібліятэкамі ў мінімальнай колькасці экзэмпляраў, то электронная форма вырашала б праблему даступнасці да запатрабаваных цікавых і унікальных тэм.

Бібліяграфічная інфармацыя займае пэўнае месца і ў камбінаваных і іншых базах даных бібліятэк па краязнаўстве: "Край мой – Магілёўшчына" Магілёўскай АБ, "Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць" Віцебскай АБ, "Памяць Міншчыны" і інш. Ствараемыя на аснове карпаратыўнага ўзаемадзеяння гэтыя БД могуць стаць буйнейшым інфармацыйным рэсурсам аб рэгіёне ў Інтэрнеце. Яны развіваюцца пакуль павольна, патрабуюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далейшай распрацоўкі ў плане канцэпцыі, напаўнення асобных тэрытарыяльных і галіновых напрамкаў і інш. Для рэалізацыі такіх праектаў НВФ "Інеак" прапанаваны праграмны прадукт "Памяць рэгіёна", які дазваляе адлюстраваць фактаграфічныя, графічныя, бібліяграфічныя матэрыялы аб адметных асобах, падзеях і фактах.

Бібліяграфічная інфармацыя з'яўляецца важным элементам і такіх інавацыйных формаў, як віртуальныя музеі знакамітых ураджэнцаў, якія ствараюцца ў бібліятэках Беларусі, асабліва Гомельскай АБ. У віртуальных музеях выдатных пісьменнікаў, ураджэнцаў вобласці, І.Мележа, Б.Сачанкі, А.Макаёнка, І.Шамякіна прадстаўлены раздзелы (спісы) іх твораў, крытычнай і біяграфічнай літаратуры (бібліяграфічныя запісы ў якіх пажадана больш дакладна структураваць).

Ад бібліятэк чакаюць і доступу да знешніх інтэрнет-рэсурсаў, і іх якаснага адбору. Гэта тэндэнцыя праяўляецца ў дзейнасці беларускіх бібліятэк, але яшчэ недастаткова. Як прыклад можна прывесці доступ да электроннага краязнаўчага каталога Бранскай АБ праз віртуальны музей прафесійнага супрацоўніцтва бібліятэк Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей "Древо дружбы" на Гомельскім інфармацыйным бібліятэчным партале. Сама абласная бібліятэка яшчэ не мае web-каталога, а ў каталогу бібліятэкі суседняй вобласці прадстаўлены дакументы, прысвечаныя падзеям, якія звязваюць сумежныя тэрыторыі і цікавыя для насельніцтва Гомельшчыны. Аднак стварэнне даведнікаў важнейшых краязнаўчых рэсурсаў, у тым ліку бібліяграфічных, як традыцыйных, так і сеткавых, – адзін з карысных напрамкаў пашырэння даступнасці краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і сродак дакладнай арыентацыі ў гіперпрасторы.

На аснове інтэрнет-тэхналогій у бібліятэках функцыянуюць службы "Запытай бібліятэкара", праз якія выконваюцца і бібліяграфічныя запыты па краязнаўстве аддаленых карыстальнікаў.

Трэба адзначыць, што сайты шэрага бібліятэк у апошні час рэканструяваны і значна палепшыліся, але пэўныя недахопы яшчэ перашкаджаюць доступу да краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў: недапрацаванасць сайтаў, іх старонак, рассеянне, "скрытасць" матэрыялаў і інш. Недастаткова ў афармленні сайтаў выкарыстоўваецца беларуская мова.

Мяркуем, доступ да унікальнай інфармацыі аб рэгіёне, якую дае краязнаўства, найлепш забяспечыць адзіны ўваход "Краязнаўства"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з галоўнай старонкі бібліятэчных сайтаў. Гэта дазваляе структураваць усе краязнаўчыя матэрыялы: базы даных, тэкставыя матэрыялы аб краі і краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі, інтэрнет-рэсурсы краю, звесткі аб краязнаўчых бібліяграфічных выданнях і электронных паказальніках, аб калекцыях каштоўных краязнаўчых дакументаў, аб новых паступленнях краязнаўчых дакументаў і інш.

---


1. *Декларация* ИФЛА о библиотеках, информационных службах и интеллектуальной свободе. – Режим доступа: http: // www.nbuv.gov.ua/law/02_iflal.html. – Дата доступа: 27.09.2009.

2. *Пилко, И.С.* Интернетизация библиотечного производства и сервиса / И.С.Пилко, Л.Г.Тараненко. – Режим доступа: http: // www.kemguki.ru/structure /inst/in_tolerannost/konf/pilko. html. – Дата доступа: 27.09.2009.

3. *Мамонтов, А.В.* Организация сводных краеведческих каталогов в областных библиотеках / А.В.Мамонтов // Сов. библиография. – 1959. – № 3. – С. 76–82.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ